Выстаўка «Шэсць стагоддзяў гісторыі медыцыны і фармацыі ў рарытэтах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі», прымеркаваная да 100-годдзя ўтварэння РУП «БЕЛФАРМАЦЫЯ», працуе ў галоўнай кніжніцы краіны. У экспазіцыі, што размясцілася ў музеі кнігі, прадстаўлены выданні, якія распавядаюць пра багатую гісторыю зараджэння і развіцця медыцыны і аптэчнай справы ў Беларусі. Крыніцы размеркаваны па чатырох раздзелах: «Медыцына», «Аптэчная справа», «Вучэнне аб леках», «Лекавыя расліны». Адным з самых старажытных экспанатаў з'яўляецца «Гербарый», які надрукаваў Петэр Шофер у Майнцы ў 1484 годзе. Між тым асабліва значнае выданне па медыцыне сярод прадстаўленых — «Салернскі кодэкс здароўя» іспанскага медыка і алхіміка Арнольда з Віланове. Выданне прысвечана правільнаму харчаванню і прадухіленню захворванняў. Убачыць гэтыя і многія іншыя экспанаты можна да 30 красавіка.